сучаснай гістарыяграфіі. Неабходна працягваць працу па захаванні, далейшым вывучэнні і папулярызацыі помнікаў гісторыі і культуры, якія маюцца ў Свіслацкім раёне. Шматлікія старонкі гісторыі рэгіёну ўжо напісаны, але многія з іх яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

Сённяшняя канферэнцыя, безумоўна, будзе карыснай у справе нацыянальна-патрыятычнага выхавання, пашырэння ведаў аб гісторыі Свіслаччыны і ўсёй Беларусі, умацавання пачуццяў гонару і любові да нашай Бацькаўшчыны.

М. А. БЯСПАЛАЯ

## УМОВЫ СТВАРЭННЯ І КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ВІЛЕНСКАГА МУЗЕЯ СТАРАЖЫТНАСЦЕЙ

Кожная новая з'ява сацыякультурнага жыцця ўзнікае пры наяўнасці пэўных умоў. Для фарміравання перадмузейных збораў, а затым на іх аснове – музеяў, неабходна, на думку музеёлагаў, некалькі ўмоў: па-першае, аб'яднанне зацікаўленых у гэтым асоб, па-другое, існаванне сацыяльнага асяроддзя, здольнага ўспрымаць новыя ідэі, па-трэцяе, наяўнасць дастаткова ўстойлівай матэрыяльнай асновы як для стварэння, так і для функцыянавання музея. Азначаныя ўмовы праявіліся ў сацыякультурнай атмасферы многіх рэгіёнаў імперыі, у тым ліку беларускіх губерняў на сярэдзіну XIX ст.

Кіраўніцтва міністэрства асветы царскай Расіі адмоўна ставіліся да шматлікіх ініцыятыў інтэлігенцыі як вялікарускіх, так і ўскраінных губерняў. Незадавальненне выклікала імкненне вывучаць фальклор і этнаграфію мясцовага насельніцтва і, асабліва, публікацыі вынікаў даследавання. У той жа час многія прадстаўнікі вышэйшых колаў імперыі захапляліся пошукамі, калекцыяніраваннем і апісаннем старажытнасцей. Пад імі разумелі, галоўным чынам, артэфакты, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак. У сталічных і мясцовых выданнях пачалі з'яўляцца публікацыі аб старажытнай матэрыяльнай культуры Полацка, Гародні, Камянца і інш.

У сярэдзіне XIX ст. у заможных колах беларускіх губерняў таксама склалася прыкметная група аматараў-даследчыкаў ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ражытнасцей. Сярод іх гісторык, этнограф, археолаг А. Кіркор, паэт Ул. Сыракомля, уладальнікі Лагойска графы Тышкевічы і інш. Такім чынам, першая з умоў узнікнення прадмузейнага калекцыяніравання – дзейнасць прыхільнікаў вывучэння культурна-гістарычнай спадчыны была відавочнай.

Зацікаўленасць, як адна з матывацый даследавання мясцовых старажытнасцей, праявілася ў братоў Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў. Падмуркам яе зараджэння стала духоўная атмасфера сям'і, дзе бацька братоў – граф Пій Тышкевіч на працягу свайго доўгага жыцця (1758–1858) актыўна цікавіўся гістарычнай спадчынай падуладнай Лагойшчыны, падтрымліваў традыцыі мясцовага рэлігійнага і культурнага жыцця. Маці – Аўгуста з сям'і Плятэраў – была высокаадукаванай асобай, прыхільніцай навук. Менавіта яна сабрала вялікую калекцыю дакументаў, кніг, карцін, старажытных прадметаў. Такім чынам, станаўленне і развіццё падрастаючага пакалення адбывалася ў высокаінтэлектуальным і рамантычна настроеным сямейным асяроддзі. Знаёмства з народнымі звычаямі, песнямі, паданнямі стала падмуркам для маральнага станаўлення і фарміравання патрыятычных пачуццяў, жадання прадоўжыць духоўную справу бацькоў.

Малодшае пакаленне сям'і – браты Канстанцін і Яўстах пачалі збіраць кнігі, рэдкія рукапісы, а затым зацікавіліся археалагічнымі раскопкамі. Прычым ініцыятарам іх выступіў малодшы брат Яўстах. З цягам часу вызначылася своеасаблівая спецыялізацыя археалагічных захапленняў – старэйшы брат займаўся раскопкамі курганоў, малодшы – гарадзішч. Самае галоўнае – Канстанцін і Яўстах Тышкевічы не спыняліся на гэтым, а ажыццяўлялі навуковы аналіз і публікавалі вынікі раскопак, фарміравалі багатую калекцыю ў радавым палацы ў Лагойску. Аб тым, што браты імкнуліся не толькі адшукаць новае, але і даць навуковае тлумачэнне знойдзеным артэфактам, сведчыць іх жаданне «выясніць ісціну і супрацьпаставіць яе ўяўленням простага люду і наіўных суседзяў…» [1, с. 61].

Лагічным прадаўжэннем зацікаўленасці братоў Тышкевічаў у вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны краю стала стварэнне музея старажытнасцеў. У навуковай літаратуры прынята лічыць, што праект яго стварэння быў распрацаваны Я. Тышке-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вічам у 1851 г. Аднак, даследчык гісторыі музейнай справы ў Беларусі А. А. Гужалоўскі ўдакладніў гэты факт і адзначыў, што ініцыятыва ў справе стварэння музея была праяўлена на тры гады раней. Высновы даследчыка пацвярджаюцца архіўнымі звесткамі. У лютым 1848 г. паміж губернскімі ўладамі Гродна і Вільні пачалася перапіска аб неабходнасці зрабіць заключэнне на запіску графа Я. Тышкевіча аб карысці заснавання ў г. Вільні краёвага музея. У ім павінны быць прадстаўлены прадметы мясцовай вытворчасці і помнікі старажытнасці. У запісцы была вызначана і сума на ўтрыманне музея [4].

Аднак працэс стварэння музея старажытнасцей зацягнуўся да 29 красавіка 1855 г., калі імператарам Аляксандрам II было зацверджана «Палажэнне аб музеуме старажытнасцей у Вільні...». Але і пасля гэтага музей не быў адкрыты. Графу Я. Тышкевічу прыйшлося займацца прывядзеннем у патрэбны выгляд залы публічных паседжанняў зачыненага Віленскага ўніверсітэта, якая была аддадзена пад музей. Ён займаўся пытаннямі рэстаўрацыі жывапісных выяў на сценах залы, рамонтам падлогі, печаў і інш.

Усё гэта патрабавала вялікіх сродкаў, і значныя ахвяраванні ў будучы музей зрабіў яго ініцыятар граф Я. Тышкевіч. Але неабходна падкрэсліць, што некаторыя памешчыкі беларускіх губерняў вызваліся быць спонсарамі і аказалі значную разавую дапамогу музею. Гэта былі прадстаўнікі заможных і ўплывовых сем’яў – графаў Чапскіх, Слізняў, Плятэраў, а таксама Скірмунтаў, Горватаў, Рудлтоўскіх, шматлікіх прадстаўнікоў роду Тышкевічаў – Міхаіла, Іосіфа і Івана Іосіфавічаў, Пія і інш. Да ідэі стварэння музея далучыліся і 8 ганаровых членаў, якія бралі на сябе абавязак штогадова ўносіць па 30 рублёў срэбрам на яго патрэбы. Сярод ганаровых сябраў музея былі князь М. Радзівіл, граф Б. М. Тышкевіч, граф Л. Марыконі і інш. [2, с. 8].

Такім чынам, вакол ідэі стварэння музея старажытнасцей сфарміравалася дастаткова шырокае кола заможных асоб, зацікаўленых у гэтай справе. З аднаго боку, яны разглядалі музей як цэнтр захавання артэфактаў гісторыі і культуры іх роднага краю, з другога, разумелі найважнейшае значэнне іх прэзентацыі сярод шырокіх колаў насельніцтва. Музей – гэта рэальная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справа, мэты і формы яго дзейнасці былі зразумелы ўсім і адпавядалі агульнаеўрапейскай тэндэнцыі. Такім чынам, у наяўнасці было значнае кола асоб, здольнае і жадаючае аказаць матэрыяльную падтрымку музею.

Музей пачынаўся не з адзінкавых музейных прадметаў, а са шматлікіх калекцый: нумізматычная налічвала да 3000 прадметаў, калекцыя гравюр, геаграфічных карт і атласаў і інш. – да 1000 прадметаў, археалагічная – да 2000 прадметаў, існавалі яшчэ тры калекцыі і вялікая бібліятэка да 1000 тамоў. Музейны збор фарміраваўся галоўным чынам за кошт ахвяраванняў. Напрыклад, граф Райнольд Тызенгаўз перадаў у музей знакамітую арніталагічную калекцыю свайго бацькі, матэрыялы сваіх археалагічных раскопак перадалі А. Кіркор і Ю. Крашэўскі, сам Яўстах Тышкевіч перадаў каля 300 прадметаў. Дзякуючы яго намаганням з Пецярбурга ў музей была перададзена калекцыя старажытнай зброі, якая да паўстання 1830–1831 гг. належала графу С. Касакоўскаму. У 1858 г. у музей былі перададзены фамільны архіў сям'і князёў Сапегаў і інш.

Прадметы музейнага значэння паступалі ў якасці падараванняў ад многіх зацікаўленых асоб. Напрыклад, Л. Кандратовіч (Уладзіслаў Сыракомля) перадаў у музей 10 тамоў «Геральдыкі» Нясецкага, дзве рэдкія манеты і 11 старажытных дакументаў, А. Кастравіцкі – падзорную трубу Т. Касцюшкі. Перадавалі ў музей самыя разнастайныя прадметы – чарнільніцы, манеты, патранташы, крыжы, кнігі, пярсцёнкі і інш. Такім чынам, Віленскі музей старажытнасцей амаль адразу меў багатыя і разнастайныя фондавыя калекцыі.

Сацыяльная база прыхільнікаў музеяў пастаянна пашыралася. Стваральнікі музея былі надзвычайна задаволены яго папулярнасцю сярод мясцовага насельніцтва, асабліва моладзі. У адным з выступленняў на пасяджэнні археалагічнай камісіі Я. Тышкевіч казаў: «З якім задавальненнем бачым мы … у нашых залах выкладанне прыродазнаўчых навук выхаванцам мясцовых навучальных устаноў, дзе прыведзеныя ў сістэму калекцыі пакідаюць… уражанне больш моцнае, чым тэорыя. З якім задавальненнем мы бачым гэтыя залы, запоўненыя ў выходныя дні маладым пакаленнем з сшыткамі ў руках … Музей наш заступае на месца пустога і бязмэтавага баўлення часу» [3,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

с. 2]. За 1856 г. музей наведала больш за 7 тыс. чалавек, а ў наступным годзе ўжо 11 800, што сведчыла аб значнай цікавасці да музея сярод розных колаў насельніцтва, нават сярод жанчын, якія складалі трэцюю частку наведвальнікаў [3, с. 3].

На першым паседжанні 11 студзеня 1856 г., кіраўніцтва музея як галоўную задачу акрэсліла ўлік музейных прадметаў, іх фіксацыю ў каталогах. Паміж прысутнымі былі размежаваны кірункі дзейнасці: М. Маліноўскаму – вядомаму ў той час даследчыку гісторыі і старажытнасцей краю, даручалася сістэматызаваць бібліятэку, стацкаму саветніку барону Л. Расільёну – манеты, медалі і інш., доктару багасloўя Гербурту – граматы, аўтографы, рукапісы, навесці ўліковы парадак у археалагічнай калекцыі даручалася А. Кіркору. Як бачым, музейная дзейнасць пачыналася з самых галоўных крокаў – уліку і захаванасці фондаў, што, згодна тэорыі музеязнаўства, уяўляе самую галоўную функцыю музея.

Аднак найбольш захапляючай дзейнасцю музея і археалагічнай камісіі, створанай пры ім, сталі навуковыя даследаванні. Раздзяляць гэты кірунак паміж музеям і камісіяй немагчыма, таму што ў іх працавалі адны і тыя ж асобы, мэтай якіх з'яўлялася markднабаковае вывучэнне беларускіх губерняў, іх гістарычнае мінулае, эканамічнае развіццё і статыстычны аналіз. Вынікі этнаграфічных, прыродазнаўчых даследаванняў, археалагічных раскопак публікаваліся у «Запісках Віленскай археалагічнай камісіі».

Віленскі музей старажытнасцей і археалагічная камісія наладзілі актыўныя міжнародныя навуковыя сувязі. Першым аб супрацоўніцтве з віленскімі калегамі заявілі Імператарскае археалагічнае аб'яднанне і публічная бібліятэка ў Санкт-Пецярбургу, затым пачаліся навуковыя стасункі з аналагічнымі аб'яднаннямі Масквы, Казані, Адэсы. Цесныя навуковыя сувязі завязаліся з Кракавам, Прагай, Стакгольмам і Капенгагенам і былі самымі разнастайнымі: абмен выпускамі навуковых прац названых таварыств, вынікамі навуковых даследаванняў, прыватнымі пісьмамі і г. д. Адносіны віленскіх навукоўцаў з калегамі былі настолькі добразычлівымі, паважлівымі, перапіска актыўнай і адкрытай, што пасля забароны дзейнасці музея і яго аб'яднання з Віленскай публічнай бібліятэкай у 1868 г., калегі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як маглі маральна падтрымлівалі віленскіх сяброў. Напрыклад, шчырае спачуванне графу Я. Тышкевічу выказаў граф А. С. Увараў – кіраўнік Імператарскага археалагічнага таварыства, А. А. Катлярэўскі з Масквы і інш. Пасля фактычнага разгрому музея Я. Тышкевіч цяжка захварэў і з’ехаў з Вільні, а К. Тышкевіч у хуткім часе памер.

Стварэнне Віленскага музея старажытнасцей стала вынікам спалучэння аб’ектыўных і суб’ектыўных умоў і, перш за ўсё, мэтанакіраванай дзейнасці братоў К. і Я. Тышкевічаў. Яе падтрымалі шматлікія прадстаўнікі адукаванага заможнага мясцовага грамадства, яна выклікала відавочную зацікаўленасць і ў шырокіх колах насельніцтва Вільні і іншых месцаў. Аналіз дзейнасці музея старажытнасцей дазваляе вызначыць праяўленне асноўных яе кірункаў: фарміраванне, улік і захаванне фондаў, навуковая, культурна-адукацыйная, экспазіцыйная дзейнасць. Безумоўна, змест музейнай работы вызначаўся інтуітыўна, на падставе штодзённага практычнага вопыту. Аднак, калі яго разглядаць з пазіцый сучаснай музеязнаўчай навукі, то трэба прызнаць, што ўмовы і матывацыя стварэння музея старажытнасцей і галоўныя кірункі яго дзейнасці адпавядаюць ёй.

На першым паседжанні археалагічнай камісіі і музея старажытнасцей адзін з яго ўдзельнікаў так абазначыў значэнне справы братоў Тышкевічаў: «…ёсць яшчэ адна завідная ўзнагарода для кожнага дзеяча на агульную карысць: гэта ўдзячная памяць і павага да самога імя, нават сярод далёкіх нашчадкаў». Сучаснае пакаленне – гэта далёкія нашчадкі знакамітых зачынальнікаў музеязнаўства ў Беларусі, сярод іх імёны і справы Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў становяцца вядомы ўсё шырэй і карыстаюцца заслужанай пашанай.

1. *Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси. XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 205 с.

2. Записки Виленской археологической комиссии. – Вильно. – 1856. – № 1. – 60 с.

3. Записки Виленской археологической комиссии. – Вильно. 1858, – № 1. – 28 с.

4. Нацыянальны гістарычны архіў у г. Гродна. – Ф. 1. В. 21. Адз. зах. 913. Л. 1.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ